**Расклад набажэнстваў на 11 лютага:**

***Св. Імша ў 10:00 – адказныя 1 і 3 раёны;***
***Св. Імша ў 12:00 – адказны 4 раён;***
***Св.Імша ў 16:00 у капліцы бл. Мучанікаў з Беразвечча ў ЦРБ – адказныя Легіён Марыі і валанцёры Caritas;***
***Св. Імша ў 18:00 – адказны 2 раён.Запрашаем усіх медыцынскіх работнікаў.***

## Сімвалічны жэст

**Заахвочваем усіх вернікаў, каб адкрыліся на церпячага чалавека праз адведзіны яго або малітву з нагоды Сусветнага дня хворых.**

**Дзеля чаго такі жэст?**

Езус чакае ад нас, каб мы наведвалі хворых, каб умелі ўбачыць Хрыста ў кожным церпячым чалавеку.
"…быў хворы і вы адведалі Мяне…" Мц 25,40



**Святы Ян Божы – апякун хворых і шпіталяў**

Нарадзіўся 8 сакавіка 1495 г. у Партугаліі. Спачаткубыў пастухом і вёўспакойны лад жыцця, але потымвырашыўуступіць у войска і апынуўся ў Афрыцы, дзепрабыўпэўны час. Дзякуючы св. Яну Авільскаму ў 1539 г. у Гранадзе (Іспанія) перажыўнавяртанне. Праз год вырашыўапекавацца беднымі, хворымі і разумоваадсталымі, для чагозаснаваўуласнышпіталь, уякім лекарскую дапамогудапаўняўдухоўнымклопатам. Святы лічыццапершапраходцам у галінеметадычнагадагляду хворых і псіхічнахворых.
Ёнпамёр 8 сакавіка 1550 г. у Гранадзе, дзе ў базыліцы, штоносіцьягоімя, да гэтага часу захоўваюццаягоныярэліквіі. Большчымпраз 30 гадоўпаслясмерцісвятогаягодухоўныядзецісклалі статут Закона братоўміласэрнасці — баніфратраў, заснавальнікамякогалічыцца Ян Божы.

**Малітва**

*Божа, Ты напоўніў святога Яна Божага духам спачування. Учыні, каб мы былі міласэрнымі да бліжніх і тым самым заслужылі ласку быць абранымі для Твайго Валадарства. Амэн.*


# Крыніца жыцця



*Ліст да ўсіх парафіянаў №17Люты 2014*
*Парафія Святой Тройцы г. Глыбокае тэл.2-32-60*


## 11 лютага – парафіяльная падзея
## "Адкрыццё на церпячых людзей"



***"…быў хворы і вы адведалі Мяне…"***

***Мц 25,40***

## Рэха мінулай падзеі



*“Я са сваім унукам упершыню ўдзельнічала ў працэсіі дароў. Мы неслі гадзіннік. Як жа мы хваляваліся! Унучак усё паўтараў: “Бабуля, вазьмі мяне з сабою, я табе заўсёды дапамагу.”А потым у сэрцы была такая радасць, так хацелася ёй дзяліцца! Дзякуй Богу за гэты дзень і час.”*

***Бабуля Ядвіга і ўнучак Саша***



*“Кожны раз, калі прымаю ўдзел у такіх супольных мерапрыемствах у парафіі, я ўсё больш пераконваюся, што касцёл гэта не будынак, у якім працуюць святары і сёстры законныя. Касцёл – гэта ўсе мы: бацькі, дзеці, бабулі, дзядулі, гэта адносіны паміж намі, напоўненыя любоўю і ўзаемаразуменнем. І ўсе парафіяне наблізіцца да касцёла, яго жыцця, жыць яго праблемамі і радасцю. Трэба быць больш ахвярнымі. Да чаго я і заклікаю ўсіх вернікаў.”*

***Даната***

## Малітва ў цярпенні

*Усемагутны вечны Божа, суцяшэнне засмучаных і сіла церпячых, пачуй просьбы тых, хто ў кожным цярпенні да Цябе звяртаецца, каб ўсе яны маглі радавацца, што ў сваіх патрэбах спазналі Тваю міласэрнасць. Просім Цябе, Пане, выслухай ласкава малітвы свайго люду і, хоць заслужана мы церпім за нашы грахі, выбаў нас праз сваю міласэрнасць дзеля хвалы Імя Твайго.*

*Божа, Ты знішчыў пыху адвечнага ворага, шатана, праз цярплівасць свайго Адзінароднага Сына, дай нам, просім, з пашанаю разважаць Яго цярпенні, якія Ён з любові да нас вынес, і дапамажы нам так, як Ён, у спакоі духа вытрываць усе перашкоды.*

*Ойча, калі Ты хочаш, то аддалі ад мянегэтыкеліх, аднак не мая, але Твая воля няхайстанецца.*

*Амэн.*

## 11 лютага – Сусветны дзень хворага

11 лютага адзначаецца Сусветны дзень хворага. Устанавіў яго бл. Ян Павел II 13 мая 1992 г. У той дзень супалі 75-я гадавіна аб’яўлення Маці Божай Фацімскай і 11-я гадавіна замаху на жыццё Вялікага Папы. Свята штогод адзначаецца 11 лютага, калі ў Касцёле ўспамінаюць першае аб’яўленне Маці Божай з Лурда. У 1858 г. у Лурдзе Маці Божая аб’явілася простай вясковай дзяўчынцы Бэрнардэце Субіру.Дзень хворага з’яўляецца напамінам для нас, каб звярнулі асаблівую ўвагу на хворых людзей і заклікае адарыць іх сваёй любоўю і клопатам. У гэты дзень святары ўдзяляюць сакрамэнт намашчэння хворых.

**У чым сутнасць сакрамэнту намашчэння хворых?**

Асноўная мэта гэтага сакрамэнту — надзяліць асаблівай ласкай хрысціяніна, які спазнае рознага роду цяжкасці, выкліканыя хваробай ці састарэлым узростам. «Небяспечна хвораму чалавеку патрэбна асаблівая Божая ласка, каб пад уплывам страху ён не ўпаў духам і, паддаўшыся спакусам, не адступіўся ў веры» («Парадак намашчэння хворых і пастырскай апекі над імі» пункт 5).Сакрамэнт намашчэння хворых, як кажа Другі Ватыканскі Сабор, прызначаны не толькі для тых, хто знаходзіцца ў канчатковай небяспецы страты жыцця, але адпаведны час прыняць гэты сакрамэнт надыходзіць ужо тады, калі вернікам пачынае пагражаць небяспека смерці па прычыне хваробы або старасці (ККК, кан. 104). Хворы, канечне, павінен быць ахрышчаным вернікам.

**Згодна з Катэхізісам Каталіцкага Касцёла:**

- хворы атрымлівае ласку ўмацавання, супакою і мужнасці, каб пераадолець цяжкасці, выкліканыя станам хваробы, або недамаганні старасці; гэта ласка Духа Святога, які аднаўляе давер і веру ў Бога, умацоўвае ў барацьбе супраць спакусаў злога духа, супраць спакусы роспачы і трывогі перад смерцю; больш за гэта — калі хворы не мог раней скарыстацца з сакрамэнту пакуты, атрымлівае ласку прабачэння грахоў;
- хворы атрымлівае сілу і дар паглыблення еднасці з мукай Хрыста; ён быццам «кансэкраваны» (выдзелены, прысвечаны), каб прыносіць плён праз прыпадабненне да збаўчай смерці нашага Збаўцы; цярпенне, якое было вынікам першароднага граху, атрымлівае новае значэнне — становіцца ўдзелам у збаўчай справе Хрыста;
- той, хто прымае сакрамэнт хворых праз з’яднанне з Хрыстом, павялічвае духоўныя даброты Божага Люду — гэта «эклезіяльная» ласка; Касцёл у супольнасці святых заступаецца малітвай за хворага, а хворы, са свайго боку, прычыняецца да святасці Касцёла і да духоўнага дабра ўсіх людзей, калі ахвяруецца праз Хрыста Богу Айцу;
- праз сакрамэнт намашчэння хворых дапаўняецца распачатая ў сакрамэнце хросту справа нашага прыпадабнення да таямніцы смерці і ўваскрасення Хрыста.